*І.М. Гоўзіч (Мінск, Беларусь)*

## Выкарыстанне літаратурных гульняў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе

Вялікую ролю літаратурных гульняў і гульнёвых элементаў на ўроку метадысты і педагогі адзначалі неаднойчы: «Без гульні няма і не можа быць паўнавартаснага разумовага развіцця. Гульня – гэта велізарнае светлае акно, праз якое ў духоўны свет дзіцяці ўліваецца жыватворны струмень уяўленняў, паняццяў. Гульня – гэта іскра, якая запальвае агеньчык дапытлівасці і цікаўнасці» [2, с. 110]. У старшых класах пры вывучэнні літаратуры можна выкарыстоўваць наступныя віды гульняў: дзелавыя і інтэлектуальныя гульні (“Поле цудаў”, “Што? Дзе? Калі?”, “Свая гульня”, “Брэйн-рынг” і інш.), крыжаванкі, віктарыны, камп’ютарныя гульні і інш.

У дзелавой гульні адлюстроўваецца прадметны і змястоўны бок прафесійнай і грамадскай дзейнасці, гэта значыць, мадэлююцца аб’ектыўныя ўмовы і сістэмы адносін, характэрныя для дадзенага віду практыкі. У дзелавой гульні закладзена магчымасць прыняць рашэнне і арганізаваць яго выкананне. Удзельнікі гульні маюць магчымасць убачыць вынікі сваёй дзейнасці, параўнаць іх з вынікамі іншых удзельнікаў.

Падрыхтоўка дзелавой гульні пачынаецца з распрацоўкі сцэнарыя. Дзелавая гульня ўключае наступныя этапы: актуалізацыя базавых ведаў, матывацыя дзейнасці вучняў, стымуляванне самастойнай пазнавальнай дзейнасці; фарміраванне творчых груп па 3-5 чалавек, прэзентацыя каманд (абмеркаванне назвы, дэвізу, эмблемы кожнай каманды). У кожнай групе выбіраюцца кіраўнікі (або адказныя); стварэнне праблемнай сітуацыі, фармулёўка праблемы; праца ў творчых групах. Кожная каманда атрымлівае творчае заданне і матэрыялы, неабходныя для яго выканання, і выпрацоўвае сваю канцэпцыю рашэння праблемы. Агульнае абмеркаванне праблемы: на дадзеным этапе здзяйсняецца калектыўная выпрацоўка рашэння праблемы. Аналіз дзейнасці кожнай каманды, вывядзенне сумарных заахвочванняў і штрафных балаў, адзнака дзейнасці ўсіх удзельнікаў групы.

Можна вылучыць наступныя віды дзелавой гульні: ролевыя, імітацыйныя (сцэнарныя), арганізацыйна-дзейнасныя. Пры ролевых гульнях у старшакласнікаў фарміруюцца прафесійныя якасці, развіваецца ўменне кіраваць іншымі. Поспех залежыць ад здольнасці вучня супрацоўнічаць з аднакласнікамі. Удзельнікі могуць пабываць у ролі настаўніка, экскурсавода, бібліятэкара, карэктара і інш. Напрыклад, на этапе ўрока праверка дамашняга задання эфектыўным і цікавым будзе правядзенне гульняў «Гарачае крэсла» і «Інтэрв’ю», у час якіх вучні самі фармулююць і задаюць пытанні па вывучаным матэрыяле аднакласнікам. Падчас імітацыйных гульняў удзельнікі выступаюць у пэўнай ролі паводле загадзя напісанага сцэнарыя, і кожны вучань звычайна выконвае адну ролю, напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вядучага літаратурнага героя, пісьменніка, вучонага, гістарычнага дзеяча і інш. Прыклады падобных гульняў: экскурсія, прэс-канферэнцыя, прэм’ера і іншыя. Настаўнік можа як будаваць цэлы ўрок па дадзенай мадэлі гульні, так і выкарыстоўваць толькі яе элементы. Арганізацыйна-дзейнасныя гульні дазваляюць правесці апытанне вялікай колькасці вучняў, у хуткай форме аднавіць вывучаны матэрыял, або актуалізаваць апорныя веды і ўменні («Пазнайце героя па апісанню», «Хто хутчэй?», «Выклік па ключавых словах», «Кракадзіл» і інш.), некаторыя з іх пабудаваны на жэстах, міміцы і пластычных рухах школьнікаў.

Так, у 11 класе пасля вывучэння тэмы «Васіль Быкаў» можна правесці гульні «Поле цудаў» ці «Што? Дзе? Калі?», з дапамогай якіх адбудзецца замацаванне ведаў пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, вучні даведваюцца пра вытокі і сакрэты таленту класіка нацыянальнай літаратуры. Пытаннямі і заданнямі для якіх могуць быць наступныя:

1. Узгадайце і працытуйце самыя цікавыя выказванні пра аповесць Васіля Быкава «Знак бяды», якія належаць вядомым дзеячам культуры.

2. Зрабіце супастаўляльную характарыстыку Петрака і Сцепаніды Багацькаў у выглядзе табліцы, падмацоўваючы свае тэзісы цытатамі з тэксту.

| Пытанне | Пятрок | Сцепаніда |
|---|---|---|
| 1. Партрэт | | |
| 2. Біяграфія | | |
| 3. Рысы характару | | |
| 4. Погляды, перакананні | | |
| 5. Адносіны да іншых | | |
| 6. Адносіны іншых да героя | | |

3. Складзіце вусныя апавяданні на тэмы: «Філасофскі змест «Знаку бяды» В. Быкава», «За што я люблю творы В. Быкава», «Васіль Быкаў і сучаснасць».

4. На якую з прапанаваных тэм вы пісалі б сачыненне: «Усё мінае — Гонар не мінае…», «Рыцар свабоды і сумлення», «Пятрок і Сцепаніда: героі ці ахвяры», «Шлях чалавека да здрады ў аповесцях Васіля Быкава». Свой выбар абгрунтуйце.

5. Складзіце віктарыну паводле выказванняў герояў аповесцей «Сотнікаў» і «Знак Бяды» на тэму «Хто прамаўляе гэтыя словы?».

7. Уявіце, што вам давялося сустрэцца з героямі твораў Васіля Быкава, якія пытанні вы б ім задалі, напішыце прагназуемыя адказы на іх.

| Герой | Твор | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|---|
| Пятрок | | | |
| Сцепаніда | | | |
| Гуж | | | |
| Сотнікаў | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

У XI класе пасля вывучэння літаратуры ў якасці абагульнення вывучанага можна прапанаваць наступную віктарыну:

1. Доўгі час беларуская літаратура XX стагоддзя ацэньвалася і характарызавалася як сялянская. Якімі аргументамі карысталіся літаратуразнаўцы і крытыкі, так яе называючы? Прозвішчы вядомых вам беларускіх пісьменнікаў мінулага стагоддзя ўпішыце ў табліцу па ніжэй прыведзеным узоры. Ці пацвярджае схема назіранні і вывады знаўцаў слоўнага мастацтва?

| Прозвішча пісьменніка | Паходжанне | Тэматычны змест творчасці | Пацвярджаецца думка навукоўцаў | Пярэчыць думцы навукоўцаў |
|---|---|---|---|---|
| Янка Купала | са шляхты | Жыццё сялян і інтэлігенцыі | + | + |
| Якуб Колас | з сялян | Жыццё інтэлігенцыі і сялян | + | + |
| | | | | |
| | | | | |

2. Адкажыце на пытанні «З займальнага літаратуразнаўства: думкі, меркаванні, здагадкі» па наступных пытаннях:

1) Які трохскладовы вершаваны памер называецца так, як і частка чалавечага цела? Чаму?

2) Адзін з двухскладовых вершаваных памераў звязаны сваёй назвай з назвай музычнага інструмента і аднаго з відаў спорту адначасова. Як гэты вершаваны памер называецца?

3) Вершаваны памер – харэй. Музычны калектыў – хор. Якая тут сувязь?

4) Як вы ведаеце, многія літаратуразнаўчыя тэрміны маюць старажытнагрэчаскае моўнае паходжанне. Некаторыя з іх звязаны з імёнамі багоў, міфалагічных істот. Што ў гэтым плане можна сказаць пра сугучча на канцы радкоў у вершах (рыфму)?

5) У якіх вобразах стаяць побач канкрэтнае, прадметнае і абстрактнафіласофскае і вынікаюць адно з другога па ледзь прыкметнаму падабенству? Хто з нашых беларускіх паэтаў удала карыстаецца падобнымі вобразамі?

6) Ці ёсць сэнсавая сувязь паміж рускім словам «тропа» (сцежка) і літаратурным тэрмінам «троп»?

7) Памяншальна-ласкальны суфікс у большасці выпадкаў сваім сэнсавым прызначэннем (прыхарошванне з’яў, «узмоцненая» станоўчая або адмоўная ацэнка іх) звязаны з нейкім тропам (тропы яшчэ па-іншаму называюцца слоўнавыяўленчымі сродкамі). З якім?

8) Назавіце тэрміны ў навуцы пра літаратуру, якія маюць усходнеславянскае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ці беларускае паходжанне і не маюць адпаведнікаў на іншаземных мовах. Некалькі такіх тэрмінаў нагадаем: пасланне, паданне, казка, апавяданне.

9) Як называецца страфа, якая складаецца з васьмі радкоў? Назавіце зборнік паэта з Лагойшчыны – прадстаўніка філалагічнага, пасляваеннага пакалення, што складаецца толькі з такога роду вершаў?

10) Назва якога метаду і літаратурнага напрамку паходзіць ад слова «узорны»?

11) Назва якога роду літаратуры і па якіх прычынах паходзіць ад назвы музычнага інструмента?

12) Творы на ўрачыстыя выпадкі жыцця – хвалебныя песні ў адрас пераможцаў на Алімпіядах у Старажытнай Грэцыі, з прычыны ваенных перамог, нейкіх значных дасягненняў, нараджэння славутых людзей-герояў, усхвалення краіны, народа – называюцца па-рознаму. У сувязі з гэтым падбярыце сінонімы да слова «ода».

3. Падрыхтуйце нататку на тэму «Беларуская літаратура XXII стагоддзя: якая яна?».

4. Паспрабуйце напісаць пажаданне будучым пяцікласнікам, выказаць ім свае парады, пажаданні і парады па вывучэнні беларускай літаратуры.

Нягледзячы на тое, што літаратурныя гульні і гульнёвыя метады навучання даюць плённыя вынікі, дапамагаюць вучням больш творча, актыўна і цікава засвойваць праграмны матэрыял па беларускай літаратуры, варта нагадаць, што нельга нівеліраваць традыцыйны ўрок, які з'яўляецца адной з асноўных форм навучання літаратуры.

1. Беларуская літаратура: зборнік творчых заданняў для тэматычнага кантролю: 10–11 класы : дапам для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.У. Грынько, А.В. Руцкая, І.М. Гоўзіч. – Мінск : Аверсэв, 2012. – 79 с.

2. Літаратурная адукацыя ў Беларусі на сучасным этапе: новыя падыходы і тэндэнцыі: зб. навук. арт. / уклад. А.І. Бельскі. – Мінск, 2008. – 228 с.

3. Методыка выкладання беларускай літаратуры: дапаможнік / І.М. Гоўзіч, А.І. Лугоўскі, С.А. Сычова. – Мінск : БДПУ, 2012. – 230 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ